Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна

№ 16 (361) | Субота, 18 красавіка 1959 года | Цана 20 кап.

# ТВОЙ СЯБРА ЎСТУПІЎ У ДРУЖЫНУ! А ТЫ?

## Сход назначае камандзіраў дружыны

*Нядаўна адбыўся адкрыты партыйны сход. З дакладам аб выкананні пастаноўлення ЦК КПСС аб удзеле працоўных у ахове грамадскага парадку ў краіне выступіў сакратар Ленінскага РК камсамола г. Мінска т. Іскра.*

*На сходзе былі назначаны камандзіры і іх намеснікі народнай дружыны універсітэта і груп на факультэтах.*

*Партсход назначыў камандзірам С. Я. Янчанку і намеснікамі тт. Сяргеева і Піскунова.*

*Зараз камсамольцы актыўна ўступаюць у дружыну. Самая вялікая масавасць у групах на біялагічным, геаграфічным і хімічным факультэтах.*

## ВЯЛІКАЯ АКТЫЎНАСЦЬ

Паведамленне аб прыняцці ЦК КПСС і Саветам Міністраў СССР спецыяльнай пастановы аб удзеле працоўных у ахове грамадскага парадку з задавальненнем сустрэлі студэнты геаграфічнага факультэта.

Адна за другой пасыпаліся заявы ў камсамольскую арганізацыю. Гэтыя заявы пішуць людзі, якія ўсім сэрцам жадаюць выканаць любое заданне нашай роднай партыі. І як гэта бывае ўсюды, уперадзе камсамольцы.

Адным з першых падаў заяву камуніст Фёдар Пятровіч. Ён вучыцца на І курсе. Сваю першую сесію здаў на выдатна. І тут ён, былы марак Балтыйскага флоту, таксама выйшаў на першую лінію. За ім запісаліся аднакурснікі Валерый Калечыц, Аляксандр Сядзееў, Пятро Рагач, Людміла Прышчэп, Ліля Калупаева і многія іншыя.

Надаючы вялікую ўвагу гэтаму руху, партыйная, камсамольская і прафсаюзная арганізацыі праводзяць немалую работу сярод студэнтаў. Былі праведзены гутаркі аб пастанове ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР. На курсавых сходах студэнты горача адгукнуліся на пастанову.

Гэтаму ж пытанню быў прысвечаны і адкрыты партыйны сход. Перад тым, як вырашыць, каго рэкамендаваць у дружыну, была склікана па ініцыятыве партыйнага бюро нарада актыву. Актывісты шырока абмеркавалі ўсе кандыдатуры. Тут былі ўлічаны і якасці студэнта, яго дысцыплінаванасць, вучоба, актыўнасць, удзел у грамадскай працы.

На партыйным сходзе з дакладам выступіў камуніст І. Я. Рагозін. Ён пазнаёміў прысутных з задачамі дружыннікаў. У дакладзе была адзначана актыўнасць студэнтаў. Падалі ўжо заявы з просьбай залічыць іх у дружыну 86 чалавек. Гэта сведчыць аб тым, што студэнты геафака прымуць вялікі ўдзел у ахове грамадскага парадку. Сярод іх нямала дзяўчат. Камсамолкі Руслана Федароўская, Тамара Болдзіна (II курс), Тамара Санковіч, Тамара Бурынская, Віка Самсонава і іншыя падалі заявы першымі на сваіх курсах.

У спрэчках па дакладу выступілі камуністы тт. Трухан, Андрушчанка.

Тут жа, на сходзе было рэкамендавана ў народную дружыну звыш 60 чалавек.

А. РУСІНОВІЧ.

# Нашы таварышы



Здараецца ж у жыцці так, што ведаеш чалавека доўгі час і раптам аказваецца, што зусім яго не ведаеш. Нейкі адзін момант, які-небудзь учынак гэтага чалавека пакажуць табе зусім іншае, што думаў аб ім да гэтага часу.

Бывае і інакш. Сустрэўшыся аднойчы, пагутарыўшы з чалавекам, зразумееш яго адразу. Яго позірк і ўсмешка, манера размаўляць і ўменне ставіцца да таго ці іншага пытання скажуць табе аб усім. І гэтае першае ўражанне застаецца, бывае, назаўсёды.

На нашай першай агульнай лекцыі са мною побач аказаўся адзін юнак. Мне адразу спадабалася яго сур'ёзная задумёнасць, тая строгая ўважлівасць, з якою ён слухаў і запісваў лекцыю.

У яго блакітных вачах, у яго цёплай, мяккай усмешцы свяцілася такая шчырасць, такое захапленне ўсім акаляючым, што адразу ж падумалася: вось такі не падвядзе ні ў якай справе, ніколі не пакіне другога ў бядзе.

З нашай гутаркі я даведалася, што пасля заканчэння дзесяцігодкі Пётр працаваў у рэдакцыі раённай газеты.

— Я быў актыўным карэспандэнтам нашай раённай газеты яшчэ з пятага класа,—неяк сарамліва сказаў ён.—Спачатку хацелася на старонках газеты расказаць аб нашых школьных справах, аб піянерскім жыцці. А потым пісаць у газету стала для мяне неабходнасцю.

Ад гэтай размовы засталося ў мяне штосьці добрае. Зараз мы часта сустракаемся на лекцыях, у бібліятэцы. І мяне заўсёды здзіўляюць яго жыццёрадаснасць, мэтанакіраванасць, яго на рэдкасць уважлівыя адносіны да таварышаў. Ён аднолькава ветлівы як з дзяўчатамі, так і з хлопцамі. Дзяўчаты заўсёды аб нечым з ім раяцца, просяць што-небудзь растлумачыць, дапамагчы. Не было яшчэ выпадку, каб у яго якая-небудзь просьба таварыша засталася без [illegible].

Пётр вельмі любіць спорт. Ён з'яўляецца варатаром зборнай каманды універсітэта па ручным мячы. Група ў пачатку навучальнага года абрала яго сваім фізоргам. Мабыць, рэдка хто ўмее так спалучаць усё разам: і спорт, і грамадскую работу, і вучобу, як гэта робіць Пётр Суша.

М. КАЛОШКА.

# ШЛЯХ У НАВУКУ

НА КОНКУРС

НАРЫС

*СВЕТЛАЯ, добра абсталяваная аўдыторыя фізіка-матэматычнага корпуса. Усюды розныя электра-радыёпрыборы, вымяральная апаратура, асобныя дэталі і цэлыя вузлы радыёпрыёмнікаў. На сценах—схемы, дыяграмы. Тут студэнты рыхтуюцца да заняткаў. Адны з іх старанна выконваюць лабараторныя работы, другія самастойна працуюць над вырашэннем складаных навуковых пытанняў. Сярод тых, хто выконвае лабараторную работу па тэме: «Зборка і настройка генератараў на паўправадніках»,—Рыгор Станкевіч, студэнт 4 курса фізфака. Ён пільна сочыць за паказчыкамі прыбораў, нешта таропка запісвае, часам задумёна ўглядаецца ўдалеч.*

*На перапынку мы пазнаёміліся з ім. Вось што ён расказаў: «Спецыялізуюся я на кафедры фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў. Мяне даўно ўжо вабіць гэтая галіна, дзе так многа яшчэ невядома чалавеку... Зараз я працую над раздзелам электронна-вылічальная машына. Тут ёсць праблемы, якія поўнасцю не высветлены, тут ёсць непачаты край работы. Усё гэта патрабуе упартай, настойлівай працы.*

*Так, Рыгор Станкевіч не памыляецца. Навука аб паўправадніках сапраўды новая. Шмат яшчэ трэба працаваць, каб адкрыць усе яе тайны і магчымасці. За кароткі час у нашай краіне дасягнуты велічныя поспехі ў гэтай галіне.*

*Штучныя спадарожнікі Зямлі, касмічная ракета... Гэта цэлыя аўтаматычныя лабараторыі, складаная апаратура якіх пабудавана на шырокім выкарыстанні паўправаднікоў. Ёсць да чаго прыкласці маладыя рукі!*

*І можна не сумнявацца, што ў вырашэнні гэтых праблем свой пасільны ўклад унясе і Рыгор Міхайлавіч Станкевіч, які ў хуткім часе ўвальецца ў вялікую армію нашых слаўных навуковых работнікаў, вучоных. Уперадзе шуканні, даследаванні...*

*А цяпер? Цяпер ён піша курсавую работу, якая, як можна думаць, перарасце затым у дыпломную.*

*Мары і планы вялікія. Але яны здзейсняцца. Вялікая прага да вучобы, упартасць і любоў да тэхнікі—найлепш пераконваюць у гэтым.*

☆

*Цяжкі шлях прайшоў Рыгор Станкевіч перад тым, як стаць студэнтам.*

*...Вайна. Родная Міншчына ў агні. Фашысцкія вылюдкі топчуць, спапяляюць яе. Крывёй абліваецца сэрца кожнага, хто быў сведкай тых жудасных год. Беларускі народ як адзін, падняўся на барацьбу з ворагам. У радах народных мсціўцаў знаходзіцца і Рыгор Станкевіч. Калі ж Чырвоная Армія вызваліла родную Беларусь, Рыгор разам з баявымі таварышамі-партызанамі ўліваецца ў адно з падраздзяленняў Чырвонай Арміі і ідзе далей, на Захад, каб разбіць ворага ў яго ж логаве. Ён удзельнічае ў баях на Вісле, у штурме Берліна. Не адзін раз смерць глядзела яму ў вочы. Савецкі ўрад высока ацаніў заслугі Рыгора Станкевіча, узнагародзіўшы яго медалямі «За баявыя заслугі», «За ўзяцце Берліна» і інш. Шмат што бачыў і перажыў Рыгор. Але думка аб далейшай вучобе нідзе не пакідае яго. Толькі не так лёгка было ажыццявіць гэтую мэту: бацькоў у Рыгора не стала яшчэ да вайны, ды і паспеў закончыць усяго толькі пяць класаў. «Аднак вучыцца буду, чаго б гэта не каштавала,—цвёрда вырашыў ён.—Цяжкасцям дарогу не ўступлю...»*

*І вось ён на заводзе, працуе граверам. Вечарамі ходзіць у школу рабочай моладзі і выдатна канчае яе.*

*Як удзельніка Вялікай Айчыннай вайны і выдатніка вучобы, Станкевіча ва універсітэт залічваюць без прыёмных экзаменаў.*

*Жыццё Рыгора не абмяжоўваецца вучобай. Ён—актыўны ўдзельнік грамадскага жыцця універсітэта. Другі раз абран намеснікам старшыні праўлення клуба, добры танцор. Рыгор Станкевіч знайшоў сваё месца ў жыцці. Ён бачыць сваю мэту і ўпэўнена крочыць да яе.*

*П. ПАНАСЮК, І. ПАТАПАЎ.*

# У нас вечар адпачынку

АДКРЫВАЕЦЦА занавес, і ў актавую залу корпуса гуманітарных факультэтаў наплывае мелодыя бяссмяротнага «Паланэза» Агінскага. Выконвае не прафесіянал-музыкант, а студэнтка І-га курса філфака Л. Емяльянава, вялікая аматарка ігры на піяніна.

На сцэну выходзіць невысокая, рухавая дзяўчына. Люся Гаро з уздымам выконвае сцэнку «Гледачы кіно» Лебядзева- Кумача. Выразная дыкцыя і прыемны голас дапамагаюць выканаўцы пераканаўча данесці да прысутных у зале слухачоў адценні перажыванняў ад дзяцей да дарослых людзей, якія яны адчуваюць пры праглядзе адных і тых жа кінафільмаў.

Студэнтка, што вядзе канцэрт, аб'яўляе:

— Макраусаў, «Расія». Выконвае студент І-га курса рускага аддзялення Л. Ліж.

Гледачы прыемна здзіўлены. Ніколі не чулі, каб Лёня спяваў, ды яшчэ на сцэне. І вось чую шэпт сваіх суседзяў-дзяўчат:

— Добра спявае хлопец!

Ён жа выконвае і нашу студэнцкую «У дзень нараджэння».

Аб'яўляецца наступны нумар:

— «Не чакай». Словы студэнткі першага курса філфака Ніны Лагун, музыка студэнта III курса Уладзіміра Карызны.

Па зале праносіцца задаволены гаварок:

— Ёсць на філфаку і свае паэты, і свае кампазітары... Малайцы!

А вось і падцвярджэнне: студэнткі Н. Лагун і С. Маркава чытаюць свае вершы. Цёпла сустракаюць іх слухачы.

Добра выконвае Валя Кажэўнікава песні: «Хвалі шэпчуць», «Калі сэрцам ты са мной», «Цішыня», якія падабаюцца ўсім.

Ю. Моцны і В. Кажэўнікава выконваюць жартоўную песню «Янічак», затым трыё Шахрай, Пашукевіч, Кажэўнікава—«Грышыцу».

Добра і цікава прайшоў вечар адпачынку, падрыхтаваны студэнтамі І-га курса філфака аддзялення рускай мовы і літаратуры

А. КАЗЯВІН.

Рыгор БАРАДУЛІН

# З АХАПКАМ ЛЕТА ЗА ПЛЯЧЫМА...

* * *

*У верасня неперайм**а**льны пах:*
*Гарыць сівец—плыве дымок гаркавы,*
*Зямлёю пахне бульба у капцах,*
*Антонаўкамі—зоры па начах,*
*І туманы—зляжалаю атавай.*
*З гароду б цэлы дзень не вылязаў.*
*Тут морква густа пырсне смачным сокам.*
*Фасоль па жэрдцы ўецца, як лаза,*
*Разломіш памідор—ён у слязах.*
*А аблачынкі ў небе так высока!*
*Радоўку адбываць гатоў заўжды:*
*Ступаеш золкай, колкаю расою—*
*Дымяцца ўсцяж зялёныя сляды...*
*Адбілася цялё ад чарады,*
*А пыса пахне цёплым сырадоем...*
*У верасня ёсць самы светлы дзень.*
*Заўсёды ён душу маю трывожыць,—*
*Хоць зноў штаны кароткія надзень*
*І, гледзячы на свой вялікі цень,*
*Пусціся басанож у падарожжа.*
*У край, дзе раніцай салодкі сон,*
*Дзе ў сумцы агурок, аловак, сцёрка.*
*А вочы расцвілі, як сіні лён,*
*Дзе пяцярнёй махае кожны клён—*
*Жадае зарабляць адны пяцёркі;*
*Дзе ў калідоры цяжка сцішыць бег,*
*Сядзець у класе—гэткая маркота,*
*А за вакном мкнуць вераб'і з-пад стрэх.*
*І як у кут паставілі за смех,—*
*Ты дома ўсім паказваеш з ахвотай...*

* * *

*Над пожняй стракацяць стракозы.*

*Пакуль Пятрок сярдзіты не прышоў*
*І не сарваў лісток з бярозы,*
*Ідзем у лес—ламаць вішшо.*

*Як парыць!*
*Конікі пілуюць ціш.*
*Смалянкі млеюць на паляне.*
*Залез на дрэва—ўніз ляціш,*
*Бяроза голлямі абвяне.*

*Бухматае і гнуткае ламай,*
*Галінку выбірай любую.*
*Бярозку адпускай—няхай.*
*К налецццю больш вішша гадуе.*

*Ды сонца ўжо з паўдня.*
*Не ранні час!*
*Вішша ляжыць у кучы многа.*
*Як мёд, такі салодкі квас,*
*І луста хлеба аржанога...*

*І ад мурашак злых, ад крапівы*
*Усё смыліць, гарыць без дыму.*
*Дадому крочыш ледзь жывы*
*З ахапкам лета за плячыма...*

*І дома вяжуць венікі з вішша.*
*А ганак сонца так нагрэла.*
*Табе ж—мурашнікі кішаць,*
*Бярозы гнуцца белым целам...*

## Маякі Бацькаўшчыны

**На карце ЗША каля 400 рускіх, беларускіх, украінскіх назваў гарадоў, рэк, паселішч і г. д. (З даведніка).**

*Не з-за прыгод якіх то-небудзь*
*Не за даўгім рублём якім,—*
*А ехалі за скібкай хлеба*
*У край далёкі землякі.*
*Рука натруджаная брала*
*З сабою ў шлях нюшок зямлі,*
*Якой чамусьці стала мала,*
*Зямлі, дзе продкі паляглі.*
*Ды помніўся ў заморскай далі*
*І звонкі бор, і мяккі мох,*
*І так паселішчы ўзнікалі:*
*Крыніца,*
*Клін,*
*Ласіны лог.*
*Там Волга забурліла смела,*
*Усхліпнуў Нёман і Дунай.*
*Пшаніца руская шумела,*
*Шаптала ўсё пра родны край.*

*І паўставала зноў такое—*
*...Аб хмары месяц чэша рог.*
*Чуваць, як коні за ракою*
*Скубуць напоўніцу мурог.*

*...Драчы асіплі за балотам.*
*Ныраюць з берага стрыжы.*
*Лазовы кол старога плоту*
*Лістамі дробнымі дрыжыць...*

*Калі ж суроваю парою*
*Нам неба засціў горкі чад,—*
*Узніклі гарады-героі:*
*Масква,*
*Адэса,*
*Ленінград...*

*Бо землякі*
*заморскай далі*
*Сынам, унукам на вякі*
*Хоць назвы родныя давалі,*
*Як*
*Бацькаўшчыны маякі.*

## ЗЯЛЁНЫ МОХ

*Уверсе высока-высока*
*Шумяць векавыя хвоі,*
*Пад корнямі снег зледзянелы,—*
*Ды ўсё ж ён прабіцца змог:*
*Рукой яго возьмеш—азяблы,*
*А пахне зямлёй, вясною*
*І леташнім лісцем прэлым*
*Зялёны-зялёны мох.*

*Далёка струной парванай*
*Піпінькне падчас сініца,*
*Крумкач праплыве ўрачыста—*
*Зусім пад вясну ахрып.*
*Наводзіць жаўрук жалейку.*
*А моху зялёнаму сніцца:*
*...Прасунуўся раннем мжыстым*
*Лабаты, крамяны грыб.*

*Маланка спрабуе арэхі.*
*Рассыпаны жарам брусніцы.*
*На сонца вужы выпаўзаюць*
*Набраць на зіму цяпла.*
*На замшавых, мяккіх лапах*
*Нячутна крадзецца лісіца,*
*Пружыніста скача заяц.*
*Вавёрка глядзіць з дупла...*

*А стане ваколле зялёным—*
*Не ўспомняць, хто зяб зімою,*
*Праз снег гаварыў пра лета*
*У сосен высокіх ля ног,*
*Зямлю ратаваў ад марозу...—*
*З кашолкамі прыдуць гурбою*
*І смела наступяць на гэты*
*Зялёны-зялёны мох...*

* * *

*Ізноў вясна гасцюе на Ушаччыне.*
*Усмешкай сонца маладзіць блакіт.*
*Няўпэўнена, з чупрынай ускалмачанай*
*Ступаюць па праталінах гракі.*

*Загаварылі льдзіны звонкай моваю,*
*Раздаўся ручаёў вясёлы спеў.*
*Пакуль што футру цёплую, зімовую*
*Таропкі заяц скінуць не паспеў.*

*Запахла багунамі і жывіцаю.*
*Хмель забрадзіў у баравых імхах.*
*А хутка гром паважны з бліскавіцамі*
*Уладна прагрукоча па шляхах.*

*На ганку новай хаты шпак высвіствае.*
*Крутым узмежкам прыпякло гарбы.*
*Як кураняты, кволыя, пушыстыя,*
*Праклюнуліся коцікі вярбы.*

НА КОНКУРС

## Разбітыя летуценні

(Гумарэска)

ПРА СЯРГЕЯ хадзіла шмат размоў. Маладыя казалі: у сэрцы гэтага хлопца каханню прызначаецца нязначны куток—таму ён і не звяртае ўвагі на дзяўчат. Старэйшыя ж сцвярджалі: «Сяргей—чалавек з розумам, не траціць марна час на гулянкі». А дзяўчаты? Тыя аж трымцелі, каб толькі спадабацца прыгожаму хлопцу. Але нязменна атрымоўвалі раўнадушны позірк, на які ў сваю чаргу, з пагардай прыўзняўшы галаву, зазначылі: «І што ў гэтым Сяргею толькі знаходзяць?.. Ат, палена нейкае, а не хлопец». А ў саміх сэрца сціскалася. Ды хіба можна спадзявацца на ўзаемнасць пасля такой «ласкі».

Сяргей быў замкнёны, ні адной жывой душы яшчэ не даводзілася пачуць ад яго хоць слоўца пра свае пачуцці. Здавалася, ён ніколі не пакахае... Але ў жыцці здараецца інакш: кажуць адно, а ў сапраўднасці іншае бывае.

Юнак хадзіў задумёны. У яго думках, як і ў кожнага чалавека, каханне таксама знаходзіла свой прытулак.

Замест таго, каб ісці ў вольны час на танцы, ці прагульвацца па парку ў пошуках сяброўкі, Сяргей аддаваўся марам. Ён яскрава ўяўляў сабе вобраз будучай знаёмай. Аднаго з ім росту, тонкая, стройная, з бялявым тварам, а вочы—выразныя, праўдзівыя і параўнаць іх можна будзе хіба з нябесным блакітам. У дадатак, па прывабнай таліі ўецца тоўстая каса. Сяргей асцярожна возьме дзяўчыну за руку, і яны пройдуць па вуліцы. Знаёмыя будуць з зайздрасцю ахаць: «Ну і прыгожую дзяўчыну заляцаў наш Сяргей!»

Хлопец цвёрда верыў—такую дзяўчыну абавязкова стрэне, настане такая хвіліна... Закружыцца галава і так захочацца прамовіць: «Я кахаю...», але лепш абыйдзецца на першы раз маўчаннем—яна і так зразумее яго.

Думкі адна за другою прабягалі ў галаве, блыталіся, пераплÿталіся, але перад вачыма ўсё ж ясна стаяла дзяўчына.

...У нядзелю з самага ранку падхмарвала. Зрэдку сеяў спорны дождж.

Сяргею над кнігай не сядзелася. Ён вышаў на вуліцу. Вечар дыхаў цеплынёй. Сэрца юнака быццам рвалася кудысьці. Сяргей пакрочыў па вуліцы, трымаючы кірунак на клуб.

У доўгай чарзе за білетамі было сумна, і Сяргей пачаў разглядаць сваіх суседзяў. З цікавасцю павярнуў галаву назад і... аслупянеў: ззаду стаяла стройная, бялявая, з быццам налітымі вішнёвым сокам губамі, з доўгай касой,—стаяла тая, аб якой марыў, якую кахаў ужо, якой шаптаў пяшчотныя словы: «Любая, харошая!..»

Хлопец не мог адарваць вачэй ад незнаёмкі, ён памкнуўся вымавіць першае слова знаёмства, але дзяўчына апярэдзіла:

— Вочы пакосіце, дзікар!

Сяргей збянтэжыўся. У гэты момант чарга падалася назад. Ад штуршка юнак страціў раўнавагу, пахіснуўся і ступіў незнарок дзяўчыне на модную туфлю. Не паспеў папрасіць прабачэння, як яго слых прарэзала шурпатае слова незнаёмкі:

— Расцяпа!

Унутры нешта рухнула, абарвалася... Пачуцці, што бярог, расціў Сяргей у сваім сэрцы, зніклі так нечакана, як бляск маланкі ў навальнічную ноч.

Сяргей непрыкметна аддзяліўся ад чаргі. Увабраўшы галаву ў плечы, ён паспяшаўся далей ад сваёй мары...

Д. БЯСПАЛЫ.



Набліжаецца абарона дыпломных, дапісваюцца апошнія старонкі.

На здымку: выконваючы абавязкі дацэнта выкладчык П. Т. Козел кансультыруе выпускніцу С. Трафімовіч.

# У НАШЫМ КАЛЕКТЫВЕ

ТРОЕ ХЛАПЧУКОЎ, сярод якіх быў і Іванка, пасвілі кароў. Час цягнуўся неяк маркотна, і каб крыху развесяліць сябе, сябры вырашылі пагуляць у «здаганялкі». Падлічылі, каму ўцякаць, а каму даганяць, і на «раз-два-тры» толькі памкнуліся кінуцца ў бакі, як з-пад іх ног раздаўся страшэнны выбух— узарвалася нямецкая міна, што засталася ад вайны.

Двух хлапчукоў забіла, а Іван страціў зрок. Да таго ж быў ён сіратой...

Але дзяржава акружыла бацькоўскімі клопатамі хлапчука. У школе-інтэрнаце, куды накіравалі яго пасля лячэння, знаходзіць Іванка новую сям'ю, сяброў, там пачынаецца яго новы шлях у жыццё.

Вайцаховіч вучыцца ў школе. Заканчвае пяты, шосты... так да дзесяці класаў і ўрэшце атрымлівае атэстат сталасці. Ён шчыра дзякуе настаўнікам, сябрам, таварышам,—яны падтрымалі яго ў цяжкі час. Іх клопаты і старанні дапамаглі юнаку стаць у строй, Жнівень 1958 года. Збываецца школьная мара. Іван Вайцаховіч залічаны студэнтам першага курса на філалагічны факультэт універсітэта. На ўсё жыццё застанецца ў памяці гэтая дата.

Зараз Вайцаховіч на першым курсе журналістыкі, жыве ў нашым студэнцкім калектыве, нашымі светлымі думкамі і поглядамі, разам з усімі дзеліць радасці і, калі здараецца,—расчараванне, бо не заўсёды бывае ў вучобе ўсе гладка і роўна.

Помніцца той дзень, калі Іван упершыню прысутнічаў на лекцыях. Кожны з нас неяк недаверліва глядзеў на хлопца: як ён зможа без зроку вучыцца, трэба ж вельмі многа чытаць.

Але мы памыляліся.

У хуткім часе Іван прымусіў нас пераканацца, што на людзей трэба глядзець інакш. У яго замест зроку ёсць вельмі выпрацаваная памяць, якая ніколі яго не падводзіць. Праслухае ён лекцыю адзін раз, і змест яе моцна трымаецца ў яго галаве—гэта дае магчымасць Вайцаховічу вучыцца на выдатна і добра.

Вайцаховіч парадаваў нас—зімовую сесію здаў на выдатна. Яму дапамагалі ў гэтым сябры па групе. Задоўга да пачатку сесіі і ў дні, адведзеныя для падрыхтоўкі да экзаменаў, у Івана штодзённымі наведвальнікамі былі аднакурснікі. «Іван прышоў да Івана»,—Жартуючы гаварыў Іван Патапаў Вайцаховічу. Потым яны садзіліся за кнігу. Патапаў чытаў, а Вайцаховіч уважліва, сканцэнтравана слухаў. Сяды-тады на момант чытанне прыпынялася — Вайцаховіч удакладняў, або прасіў яшчэ перачытаць абзац, каб не засталося «белай плямы» ў пройдзеным матэрыяле. Вось так крок за крокам, дзень за днём набываліся веды.

Інтэрнацкі пакой, дзе жыве Вайцаховіч, наведвае кожны студэнт групы. Гэта Павел Панасюк, Анатоль Кудравец, Ларыса Новікава і Ларыса Малінковіч, Леанід Макарэнка... І не толькі заходзяць чытаць тэкст, а часта наведваюць проста так, каб паразмаўляць, сказаць цёплае, душэўнае слова, расказаць навіны.

У нашым студэнцкім калектыве Вайцаховічу не даводзіцца сумаваць. На яго твары заўсёды ветлівая, жыццёрадасная ўсмешка, і яна ніколі не пакіне юнака, бо ў яго ёсць і будуць сапраўдныя сябры, якія заўсёды падтрымаюць, дапамогуць словам і справай.

Б. ДЗІМІТРАЎ.

# У НАС У ГАСЦЯХ

11 красавіка ў актавай зале корпуса гуманітарных навук адбылася сустрэча студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта з першым намеснікам міністра школ і культуры Чэхаславацкай рэспублікі т. Пелішкам.

Тав. Пелішак расказаў аб народнай асвеце ў Чэхаславакіі, аб развіцці навукі і культуры ў рэспубліцы, падзяліўся сваімі ўражаннямі аб Савецкім Саюзе.

У заключэнне т. Пелішак адказаў на шматлікія пытанні прысутнічаючых.



НА ЗДЫМКУ: Майстар спорта Гурвіч, якая заняла першае месца ў трохбор'і, пераадольвае планку, устаноўленую на 1 м. 40 см. Фота А. МІХАЙЛАВА.

# СПРАВЫ *інтэрнацкія*

**Нядаўна стан інтэрнатаў правяралі камісіі, якія падводзяць вынікі спаборніцтва на лепшы інтэрнат і на лепшыя пакоі ў інтэрнатах. Аб тым, што бачылі ў некаторых пакоях члены камісій, расказваюць малюнкі нашых карыкатурыстаў.**

Жыхары пакою № 11 студэнты II курса фізфака Яўладаў і Гаўрон пры набліжэнні санкамісіі ўцяклі праз вакно.



Стаць не можа
гэткі цуд—
Сам не знікне
ў момант бруд.
Дык па прыкладу
сяброў:
Праз вакно—
і будзь здароў!

Жыхары пакою № 103 інтэрната па вуліцы Свярдлова (стараста Паздняк) доўга не адчынялі дзверы.



Добра, калі ёсць
замок.
Два абароты—
і маўчок.
Калі ж няма—ну як
даць рады?—
Хутчэй узводзіць
барыкады!

У пакоі № 108 інтэрната па вуліцы Свярдлова, дзе жывуць аспірант Малашка і студэнт 5 курса хімфака Александровіч, вельмі брудна, ложкі былі не засланы.

Каб навесці тут парадкі,
Самазвал патрэбна
клікаць.
Дык лягчэй праклaсці
кладкі,
Каб не ўвязлі чаравікі.
Ходзяць жыхары
ў спакоі.
Дык хто ж вынайшоў
такое?!
Адгадаць зусім
нецяжка—
Аспірант А. М. Малашка.



У пакоі № 38 корпуса «Б» інтэрната на Бабруйскай усе жыхары ў час праверкі спалі пасля ўчарашняй п'янкі.



— Вы чаго, хлопцы, на лекцыі не ходзіце?
— Не магу пакінуць хворага сябра. У яго тэмпература аж 40 градусаў.

Універсітэты свету

# Такійскі універсітэт

*ЗАСНАВАНЫ ў 1877 ГОДЗЕ, Такійскі універсітэт з'яўляецца буйнешай і старэйшай вышэйшай навучальнай установай Японіі. У 1954 годзе ва універсітэце навучалася каля 10 500 студэнтаў і звыш 2 000 аспірантаў і дактарантаў. Структура і арганізацыя работы універсітэта ў пэўнай ступені з'яўляецца ўзорам для другіх універсітэтаў краіны.*

*Універсітэт складаецца ў цяперашні час з 9 факультэтаў: агульнаадукацыйнага, юрыдычнага, медыцынскага, інжынернага, літаратурнага, прыродазнаўчых навук, сельскагаспадарчага, эканамічнага і педагагічнага.*

*Падрыхтоўка навукова-даследчых кадраў вядзецца ў аспірантуры і дактарантуры (у Японіі гэта адзіная арганізацыя, якая называецца школай аспірантаў і дактарантаў, якая складаецца з 5 аддзяленняў).*

*Пры універсітэце ёсць наступныя навукова-даследчыя інстытуты і ўстановы: інстытуты навукі і тэхналогіі, прамысловых навук, усходняй культуры, грамадскіх навук, журналістыкі, прыкладной мікрабіялогіі, інфекцыйных хвароб, гісторыяграфіі, па вывучэнню землятрасенняў, астранамічная абсерваторыя і лабараторыя па вывучэнню касмічных праменняў. Нядаўна арганізаваны інстытут па вывучэнню атамнага ядра.*

*Пры універсітэце ёсць таксама бальніца, лабараторыя па вывучэнню дзейнасці мозга (цэнтральнай нервовай сістэмы), марская біялагічная станцыя, батанічныя сады, універсітэцкія фермы і лясы, лабараторыя іхтыялогіі, ветэрынарная бальніца, жывёлагадоўчыя фермы, сярэдняя школа першай ступені, сярэдняя школа другой ступені і школа медыцынскіх сясцёр. Усе гэтыя ўстановы звязаны з адпаведнымі факультэтамі.*

*Універсітэцкі гарадок Хонга займае тэрыторыю каля 40 гектараў, на якой сканцэнтравана большасць факультэтаў і навукова-даследчых устаноў.*

*На чале універсітэта стаіць рэктар (у Японіі ён называецца прэзідэнтам), які кіруе дзейнасцю ўсяго навукова-педагагічнага і адміністрацыйна-гаспадарчага персаналу.*

*Пад кіраўніцтвам рэктара працуе кансультатыўны савет, які называецца універсітэцкім сенатам і складаецца з дэканаў факультэтаў, прафесараў, што выбіраюцца ад кожнага факультэта, дырэктараў інстытутаў і старшынь камітэтаў аспірантуры і дактарантуры. Функцыі сената заключаюцца ў тым, каб разгледзець і рэкамендаваць рэктару універсітэцкія бюджэтныя каштарысы, рэгуляваць і каардынаваць работу факультэтаў і інстытутаў, а таксама дзейнасць універсітэта.*

*Пытанні вучэбнай і даследчай дзейнасці факультэта вырашаюцца на сходах прафесараў данага факультэта: старшынствуе на гэтых сходах дэкан.*

*У аспірантуры і дактарантуры кожнае аддзяленне мае выбарны камітэт на чале са старшынёй. Работу гэтых камітэтаў каардынуе савет аспірантуры і дактарантуры.*

*Вучэбную і навукова-даследчую работу ва універсітэце праводзяць прафесары, асістэнты-прафесары (памочнікі прафесараў—нешта накшталт дацэнтаў), асістэнты і лектары. Звычайна лектары выконваюць тыя ж функцыі, што прафесары і асістэнты-прафесары.*

*Тэрмін навучання на ўсіх факультэтах Такійскага універсітэта—4 гады.*

*Першыя два гады студэнты навучаюцца на агульнаадукацыйным факультэце, два гады — праходзяць падрыхтоўку па спецыяльнасці на любым факультэце па выбару. Выключэнне складае медыцынскае аддзяленне медыцынскага факультэта, на якім для навучання па спецыяльнасці адводзіцца 4 гады дадаткова да 2 гадоў навучання на агульнаадукацыйным факультэце (г. зн. усяго тут навучаюцца 6 год). На двух другіх аддзяленнях тэрмін спецыяльнага навучання такі ж, як і на іншых факультэтах,—2 гады.*

*Акадэмічны год пачынаецца з 1 красавіка і канчаецца 31 сакавіка наступнага года.*

*Паступаючыя ў Такійскі універсітэт здаюць прыёмныя экзамены. Да іспытаў дапускаюцца асобы, якія закончылі сярэднюю школу другой ступені, г. зн. якія атрымалі 12-гадовую школьную адукацыю або якія здалі экстэрнам экзамен за поўную сярэднюю школу.*

*Студэнты, якія закончылі курс навучання і паспяхова здалі экзамены, устаноўленыя уставам адпаведных факультэтаў, атрымліваюць універсітэцкі дыплом. Заканчваючым прысвойваецца званне бакалаўра па спецыяльнасцях: права, медыцыны, прыродазнаўчых навук, сельскагаспадарчых навук, філалогіі, педагагічных навук.*

# Поспех матэматыкаў

**Лёс першага месца ў першынстве універсітэта па баскетболу сярод жаночых каманд вырашыла сустрэча баскетбалістак матфака і гістфака. Цікавая вострая гульня прынесла важную перамогу матэматыкам (34:30) і па сутнасці званне чэмпіёна універсітэта на 1959 г. Затым дзяўчаты матфака лёгка абыгралі біёлагаў (32:10), юрысты на 33 ачкі адказалі толькі 8, філолагі таксама не змаглі аказаць сур'ёзнага супраціўлення. Каманда матфака прыкметна адрознівалася ад саперніц і па тэхніцы, і па фізічнай падрыхтоўцы. Другое месца заняла каманда гістфака, якая мела толькі адно паражэнне, трэцяе—біяфака.**

**У мужчын званне чэмпіёна таксама заваявалі матэматыкі, хоць пасля першых сустрэч лідыравалі хімікі, якія атрымалі запар пяць перамог. На фінішы баскетбольнага турніра хімікі прайгралі гісторыкам і матэматыкам і выйшлі на другое месца. Каманда гуляла самаадданa, напорыста, дружна.**

**На трэцім месцы каманда фізфака. Філолагі і гісторыкі набралі аднолькавую колькасць ачкоў, але ў гісторыкаў лепшыя суадносіны закінутых і прапушчаных мячэй.**

**Вельмі слаба выступілі баскетбалісты геафака. Мужчыны занялі сёмае месца, жанчыны—шостае. Жанчыны гулялі ніжэй сваіх магчымасцей, а часам зусім бездапаможна. Вось, напрыклад, у сустрэчы з жаночай камандай юрфака географы вялі першую палавіну з лікам 2:0. Гледачы жартавалі, што «каманды упорна абараняюцца», сілы, маўляў, роўныя. Не, проста абедзве каманды паказалі тэхнічную непадрыхтаванасць, няўменне трапна кідаць мяч.**

**Г. Фамін.**



**НА ЗДЫМКУ: Лік у карысць «працаўніка», і гісторыкі бяруць мінуту. Дружная гульня гэтай каманды прынесла ёй другое месца.**

**Фота А. МІХАЙЛАВА.**

# Аб манерах добрага тону

Калі мы гаворым аб выхаваным чалавеку, дык перш за ўсё, маем на ўвазе яго ўменне сачыць за сабой, звычку заўсёды кантраляваць сябе, свае дзеянні і ўчынкі.

Гэтае ўменне, у прыватнасці, выражаецца ў пастаяннай ахайнасці чалавека, у гідлівай нецярпімасці да бруду. Не пустой умоўнасцю, а разумнымі гігіенічнымі меркаваннямі прадыктаваны такія правілы добрага тону, як клопаты аб чысціні свайго цела, аб свежасці бялізны і насавых хустачак, аб ахайнасці верхняга адзення і абутку.

Безумоўна, любы мужчына ведае, што ён заўсёды павінен быць чыста паголены, а тым не менш некаторыя голяцца толькі тады, калі ідуць у тэатр, у госці альбо на спатканне, але лічаць гэта неабавязковым, калі знаходзяцца на рабоце ці застаюцца дома, у сям'і, з жонкай.

Аб выхаванні чалавека мы мяркуем не па тым, наколькі ён разумее важнасць ахайнасці, а па тым, ці сталі гэтыя якасці натуральнай патрэбнасцю чалавека, яго звычкамі.

Выхаваны чалавек павінен сачыць за сваім знешнім выглядам. Не ва ўсіх ёсць магчымасць пашыць сабе модны касцюм, сукенку ці паліто (ды гэта і не ўваходзіць у патрабаванне добрага тону), але затое кожны можа дабіцца, каб яго адзенне было чыстае, адпрасаванае, зацыраванае. Цяга абагнаць моду, давесці яе да крайнасці, абсурду (як гэта робяць так званыя «сцілягі»), сведчыць аб няскромнасці, аб жаданні сваім знешнім выглядам здзівіць акружаючых, звярнуць на сябе ўвагу, што не мае нічога агульнага з добрым тонам.

Не трэба таксама «ўпрыгожваць» адзенне аляпаватымі і штучнымі кветкамі. Не трэба насіць каштоўнасці, якія маюць характар толькі ўпрыгожванняў і не выконваюць ніякай карыснай ролі: кулоны, браслеты і г. д.

Жанчына павінна трымаць у абсалютным парадку, перш за ўсё, прычоску, абутак, сумку, пальчаткі. Не трэба душыцца многа і моцнымі духамі, таму што іх пах можа быць непрыемным для акружаючых. Дома можна хадзіць у піжаме, але толькі надзетай паверх сарочкі. За стол у піжаме можна садзіцца толькі тады, калі няма нікога з пабочных,—у другім выпадку трэба апрануцца ў звычайнае адзенне. У халаце і начных туфлях можна хадзіць толькі ў ваннай і спальні.

Неад'емнай якасцю выхаванага чалавека з'яўляецца дысцыплінаванасць у шырокім сэнсе гэтага слова, самакантроль. Культурны чалавек павінен уважліва кантраляваць усе свае рухі, імкнучыся да таго, каб яны былі простымі і натуральнымі, без усялякай грубасці, развязнасці. Цвёрдая, спакойная паходка, як у спартсмена і воіна, скупыя і выразныя жэсты, манера сядзець не развальваючыся на крэсле, не закідваючы нагу на нагу (пазбягаючы пры гэтым і другой крайнасці—не сядзець на канцы крэсла ў позе беднага сваяка),—усё гэта разумныя патрабаванні добрага тону. Мітуслівасць і нервовасць у рухах, звычка звяртацца да тэатральных жэстаў, развязнасць і грубасць—усё гэта сведчыць аб дрэнных манерах. Патрэбна адвучыць сябе ад некаторых звычак, якія робяць чалавека непрыемным альбо нават смешным: чысціць пальцам нос, пачэсваць галаву, чапаць рукамі чужую рэч, што-небудзь камячыць або вярцець у руках і г. д. Неабходна стрымліваць зевату, чхаць у насавую хустачку (а калі чхнуў хтосьці другі, не звяртаць на гэта ўвагі і не жадаць добрага здароў'я). У час размовы не трэба датыкацца да рукі ці пляча субяседніка, да гузікаў на яго пінжаку і г. д.

**М. ГАРДЗІЕНКА.**

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 60; тэл. 2-07-19. Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

Друкарня выдавецтва БДУ імя Ул. І. Леніна. Тыраж 2000 экз. Зак. 539.